## На вуліцу!

Прэзідэнт Акадэміі навук БССР Павел Восіпавіч Горын аднекваўся, як мог, а славуты майстра па шахматах вельмі хацеў згуляць з ім партыю.

— Нарэшце, я згодны даць вам фору, — сказаў майстра.

— Якую фігуру? — пацікавіўся Павел Восіпавіч.

— Ну, напрыклад, слана.

— Давайце ладдзю!

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Тут сядзеў Чарвякоў і ўважліва слухаў гаворку.

— Згаджайцеся на слана, — параіў ён Горыну. — Гэта нямала. У вас будзе значная перавага.

Пачалася гульня. На трэцім ходзе майстра па шахматах задумаўся. Запусціўшы ў густую шавялюру кароткія тоўстыя пальцы, доўга сядзеў моўчкі. Горын, здаецца, зусім не думаў над хадамі, перастаўляў фігуры нібы жартам. Між тым ён збіраў сілу ў цэнтры поля, але рабіў гэта з нейкай дзіцячай бесклапотнасцю. Па яго твары можна было бачыць, што ніякіх сур'ёзных планаў у яго няма і ўсё, што ён робіць,— адна забава.

Праціўнікі размяняліся некалькімі пешкамі, адной парай лёгкіх фігур. Тут якраз і высветлілася, што майстра па шахматах трапіў у пастку, якую спакваля падрыхтаваў яму прэзідэнт.

— Здавайцеся, майстра! — весела сказаў Горын. — У вас няма выйсця.

— Вы проста малайчына, — сказаў Чарвякоў Горыну. — Здорава гуляеце ў шахматы, у вас вялікія здольнасці.

— Ды што вы, Аляксандр Рыгоравіч, — засаромеўся прэзідэнт, — якія там здольнасці.

Мы сядзелі да позняй ночы. Наш вагон быў прычэплены ў самым канцы цягніка. На стрэл-

ках і закругленнях яго кідала ў бакі. Аляксандр Рыгоравіч ехаў у Маскву старшынстваваць у ЦВК СССР, дзе ён на пэўны час замяшчаў Міхаіла Іванавіча Калініна.

— Ёсць у мяне для вас адна загадка, — раптам сказаў Чарвякоў. Ён пайшоў у сваё купэ, хутка вярнуўся і паклаў на стол аматарскі фотаздымак. — Паглядзіце, таварышы, і скажыце: хто гэтыя дзеці?

Мы пачалі разглядаць фота. Тры вясковыя дзяўчынкі глядзелі на нас. Старэйшай было год дзесяць, а яе сяброўкам ці сёстрам — і таго менш. Босыя. Саматканыя сукенкі. Раскудлачаныя, даўно не чэсаныя валасы. Худзенькія тварыкі. Бачна, што гэтым дзецям нялёгка жывецца на свеце. Але здзіўлялі вочы. Яны кантраставалі з вопраткай, агульным абліччам.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы